Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых

## даведнік
## па вуліцах Кобрына,
## якія носяць імёны ўдзельнікаў
## Вялікай Айчыннай вайны

Кобрын
2004

# Прадмова

Перамога Савецкага Саюза над фашысцкай Германіяй ў Айчыннай вайне – адна з вялікіх падзей гісторыі. І чым больш час аддаляе нас ад гэтай знамянальнай сусветна-гістарычнай даты, тым мацней прыцягвае яна да сябе ўвагу людзей.

Прайшлі гады, дзесяцігоддзі, але ніхто не забыты і нішто не забыта. Удзячны беларускі народ ніколі не забудзе сваіх слаўных вызваліцеляў, многія з якіх загінулі смерцю герояў. Некаторыя з іх вярнуліся да нас у назвах вуліц. Гэтыя назвы быццам жывыя сведкі апавядаюць пра бяспрыкладны подзвіг і мужнасць удзельнікаў вайны.

Удзячная памяць захавала такія прозвішчы і ў нашым горадзе. Кабрынчане свята шануюць і захоўваюць памяць аб тых, хто загінуў у баях з ворагам. 15 вуліц горада носяць імёны герояў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай.

Назвы вуліц нагадваюць і аб тых, хто аддаў жыццё за вызваленне Кобрыншчыны. На кобрынскай зямлі здзейснілі свой подзвіг В. П. Пуганаў, А. І. Марозаў, А. Ф. Данілеўская, Б. М. Сурын, С. Я. Ягораў, Ц. М. Краўчук. У гонар іх, тых, хто загінуў вызваляючы Кобрын, хто мужна змагаўся пры абароне яго і праявіў гераізм, названы 6 вуліц нашага горада.

Гэты даведнік выходзіць да 60-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзя Перамогі. Ён разлічаны на шырокае кола чытачоў, моладзь. Пры падрыхтоўцы дапаможніка былі выкарыстаны наступныя крыніцы: каталогі, картатэкі, архіўныя матэрыялы, дакументы з аддзела архітэктуры.



# Вуліца Пуганава

17 чэрвеня 1964 года рашэннем выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных завулак Прамы быў перайменаваны ў вуліцу імя Пуганава. Яна размешчана ў паўночна-заходняй часцы горада. Адкрываецца вуліца мемарыяльнай дошкай, на якой мы чытаем "Вуліца імя ***Пуганава Віктара Паўлавіча***". Камандзір 22 танкавай дывізіі генерал-маёр Пуганаў загінуў у танку пры абароне Радзімы ў наваколлі горада Кобрына ў вёсцы Імяніны 23 чэрвеня 1941 года."

Савецкі военачальнік нарадзіўся 27 студзеня 1901 года ў г. Астрахані. Працаваў пасыльным на чыгунцы, а ў 1919 г. уступіў у Чырвоную Армію. У 1928 г. В. Пуганаў закончыў ваенную акадэмію імя Фрунзе, пасля чаго быў накіраваны ў Ленінград выкладчыкам бранетанкавых курсаў.

У 1940 г. яму было прысвоена званне генерал-маёра танкавых войск, і са жніўня 1940 года па сакавік 1941 года Віктар Паўлавіч служыў начальнікам упраўлення баявой падрыхтоўкі аўтабранетанкавых войск Чырвонай Арміі.

Пазней ён быў назначаны камандзірам 22-й танкавай дывізіі 14 механізаванага корпуса, які дыслацыраваўся ў раёне Брэста. Тут ён і сустрэў Вялікую Айчыную вайну. Сумесна з 6-й і 42-й дывізіямі 22-я танкавая ўпарта супраціўлялася націску ворага. Савецкія воіны змагаліся да апошняй магчымасці. Непадалёку ад вёскі Імяніны геройскі загінуў у танку Віктар Паўлавіч Пуганаў. Тут байцы і пахавалі свайго камандзіра.

У канцы 50-х гадоў было зроблена перазахаванне ў брацкай магіле ўсіх воінаў, якія загінулі ў баях за наш горад. Побач з брацкай магілай перазахавалі астанкі В. П. Пуганава, а сквер назвалі яго імем.



## Вуліца Марозава

Імем Героя Савецкага Саюза названы сквер і адна з вуліц г. Кобрына. Вуліца знаходзіцца на зарэчнай часцы горада.

***Арсеній Іванавіч Марозаў*** нарадзіўся 23 студзеня 1922 года ў вёсцы Слабодка Калінінградскай вобласці. Закончыў прафтэхвучылішча ў г. Цвер (1938), Батайскую

ваенную школу пілотаў (1941). Да вайны працаваў слесарам на Цвярской прадзільнай фабрыцы і займаўся ў аэраклубе.

З першых дзён вайны Марозаў дабраахвотнікам пайшоў на фронт. Ён прайшоў шлях ад радавога да намесніка камандзіра авіяэскадрыллі. Ваяваў на Паўднёвым, Заходнім і 1-ым Беларускім франтах. Зрабіў 271 баявы вылет, 30 паветраных баёў, асабіста збіў 13 самалётаў праціўніка і 9 – у групавых баях; знішчыў 4 варожыя самалёты на аэрадромах, 3 чыгуначныя вагоны з боепрыпасамі, 18 аўтамашын з грузамі. А. І. Марозаў быў лепшым лётчыкам корпуса, любімцам палка і дывізіі.

У складзе 149-га Чырвонасцяжнага Памеранскага зніш-чальнага палка, які базіраваўся на Кобрынскім аэрадроме, старшы лейтэнант А. І. Марозаў быў намеснікам камандзіра эскадрыллі. Калі пачаліся баі на подступах да Брэста, ён атрымаў заданне штаба фронту разведаць сілы гітлераўцаў і шляхі іх адступлення. 24 чэрвеня 1944 года пасля паспяховай разведкі А. І. Марозаў вяртаўся на аэрадром, але ўбачыў вялікую колькасць варожай тэхнікі і войск і папрасіў дазволіць штурмоўку. Лётчык, атрымаўшы смяротнае раненне, з апошнімі сіламі давёў падбіты самалёт да аэрадрома. Пахаваны ў Кобрыне, у скверы, які сёння носіць яго імя. 25 лютага 1945 года А. Марозаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна.



# Завулак імя Ягорава

У 1964 годзе да 20-годдзя вызвалення г. Кобрына па рашэнні выканкама завулак Лугавы перайменаваны ў завулак імя Ягорава. ***Сяргей Ягоравіч Ягораў*** нарадзіўся ў 1901 годзе ў пасёлку Удзельная Раменскага раёна Маскоўскай вобласці. У 1921 годзе ўдзельнічаў у падаўленні Кранштацкага мецяжу. З 1936 года працаваў першым сакратаром Ягор'еўскага райкама ВКП(б) Маскоўскай вобласці.

Першую баявую ўзнагароду – ордэн Чырвонага Сцяга - С. Я. Ягораў атрымаў за ўдзел у фінскай кампаніі. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у Брэсцкай вобласці на пасадзе намесніка камандзіра па палітчасці 15-га стралковага палка 49-й стралковай дывізіі. У няроўных баях першых дзён вайны часць была разбіта. Апынуўшыся ў акружэнні ў Белавежскай пушчы, С. Я. Ягораў уключыўся ў антыфашысцкую барацьбу. У ліпені 1942 года ён быў адным з арганізатараў разгрому варожага гарнізона ў Косаве. Пазней партызаны перабраліся ў Пінскую вобласць, дзе ён быў назначаны камісарам

спачатку атрада імя Варашылава, а затым атрада імя Шчорса. З красавіка 1943 года С. Я. Ягораў – намеснік партызанскага руху па Брэсцкай вобласці па партыйна-масавай рабоце. 11 чэрвеня 1944 года самалёт, на борце якога ляцеў Ягораў, быў збіты фашыстамі.



## Вуліца Данілеўскай

Гэту назву вуліца атрымала 15 мая 1963 года (па рашэнні Кобрынскага гарвыканкама № 199). Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.

***Аліса Фёдараўна Данілеўская*** нарадзілася 22 жніўня 1893 года ў Кіеве. Там закончыла жаночую гімназію, дзе ў дасканаласці вывучыла нямецкую мову. У лістападзе 1943 года гітлераўцы вывозілі жыхароў з Кіева на работу ў Германію. З-за дыверсіі партызан на чыгунцы эшалон, у якім везлі А. Ф. Данілеўскую і іншых, спыніўся непадалёку ад Кобрына. Данілеўскай удалося збегчы, і яна пасялілася ў вёсцы Малыя Лепясы ў Міхаіла Паўлючыка. Хутка з ёю ўстанавілі сувязь партызаны разведвальна-

дыверсійнай групы маёра Савельева. А. Ф. Данілеўскай, якая да гэтага часу ўладкавалася працаваць у штаб танкавай часці, што стаяла ў Кобрыне, было даручана ўзарваць яго. А. Данілеўская і Л. Біхерт выканалі заданне. Магутны выбух знішчыў штаб разам з усімі гітлераўцамі, што там знаходзіліся.

Акупанты схапілі адважных патрыётак, але, нягледзячы на жорсткія катаванні, яны нікога не выдалі. 4 мая 1944 года іх павесілі на плошчы Свабоды ў г. Кобрыне.

На нашай кобрынскай зямлі А. Ф. Данілеўская зрабіла апошні крок у бессмяротнасць. Сёння адна з гарадскіх вуліц носіць імя адважнай патрыёткі Алісы Данілеўскай.



## Вуліца Краўчука

6 мая 1965 года выканкам раённага Савета дэпутатаў працоўных рашыў назваць вуліцу ў паўночнай частцы горада імем партызана Цімафея Міхайлавіча Краўчука.

***Цімафей Міхайлавіч Краўчук*** нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Турная. У гады гаспадарання на нашай зямлі памешчыцка-буржуазнай Польшчы Ц. М. Краўчук быў актыўным барацьбітом за ўз’яднанне з Савецкай Беларуссю. У 1927 годзе ён стаў членам КПЗБ. У 1940 годзе арганізаваў першы ў Кобрынскім раёне калгас - імя Калініна. У жніўні 1941 года быў адным з арганізатараў падпольнага антыфашысцкага камітэта вёскі Турная, выбраны намеснікам сакратара, у 1942 годзе стаў на чале камітэта. Забіты 19 красавіка 1944 года ў час перастрэлкі з карнікамі, якія акружылі в.Турная.



## Вуліца Сурына

***Барыс Мікалаевіч Сурын*** нарадзіўся 2 жніўня 1907 года ў Ленінградзе, у сям’і служачых. У 1926 годзе быў накіраваны на вучобу ў артылерыйскую школу, ў 1928 – пачаў служыць у Чырвонай Арміі, затым вучыўся ў ваеннай школе лётчыкаў, у 1938 годзе яго назначылі

камандзірам эскадрыллі знішчальнага авіяпалка, а ў 1940 – камандзірам 123 знішчальнага авіяпалка.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны гэты полк нёс пастаяннае дзяжурства на асноўным аэрадроме і паблізу граніцы для перахвату нямецкіх самалётаў, якія парушалі нашу паветраную прастору.

22 чэрвеня 1941 года, каля дзвюх гадзін ночы, камандзір палка Б. М. Сурын падняў увесь састаў па баявой трывозе. Як толькі закончыўся налёт ворага, маёр Сурын аддаў загад усім узняцца ў паветра. У першы дзень вайны лётчыкі палка на працягу 10 гадзін вялі бесперапынны паветраны бой і збілі 30 варожых самалётаў, страціўшы пры гэтым 9 сваіх.

Барыс Мікалаевіч Сурын у гэты дзень правёў 4 паветра-ныя баі, збіў 3 самалёты ворага, але сам атрымаў смяротнае раненне. Ён змог яшчэ пасадзіць свой самалёт на аэрадром, але калі таварышы падбеглі да яго, камандзір быў мёртвы. Яго пахавалі непадалёку ад Кобрына. Першы камандзір 123-га авіяпалка назаўсёды застаўся на кобрынскай зямлі.

Удзячныя жыхары Кобрына па рашэнні выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных 17 чэрвеня 1964 года назвалі вуліцу яго імем.



# Вуліца маршала Жукава

Па рашэнні выканкама № 127 ад 18 мая 1989 года вуліца Жданава была перайменавана ў вуліцу Маршала Жукава. Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай частцы горада.

***Георгій Канстанцінавіч Жукаў*** – савецкі ваенны і дзяр-жаўны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза (1943), чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956 гг.), Герой Манголіі (1969).

Г. К. Жукаў нарадзіўся ў 1896 годзе ў Калужскай вобласці. У арміі з 1915 года; удзельнік Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў. З 1930 года камандзір 2-й кавалерыйскай брыгады 7-й дывізіі (штаб у Мінску), у 1933-1937 - 4-й кав. дывізіі імя К. Варашылава, 3-га кав. корпуса (штаб у Мінску). У 1938-1939 гг.- намеснік па кавалерыі каманднымі вайскамі Беларускай асобнай ваеннай акругі. У 1939 годзе камандаваў савецка-мангольскай групоўкай у час канфлікта з Японіяй на рацэ Халхін-Гол. З 1940 года камандуе войскамі Кіеўскай

асобнай ваеннай акругі. У студзені-ліпені 1941 года - начальнік Генштаба, намеснік наркама абароны СССР. З 23 чэрвеня 1941 года - член Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, са жніўня 1942 года - 1-й намеснік наркама абароны СССР і намеснік Вярхоўнага галоўнакамандуючага; камандаваў Рэзервовым, Ленін-градскім, Заходнім, 1-ым Украінскім, 1-м Беларускім франтамі. Адзін з кіраўнікоў абароны Ленінграда, Масквы і разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой. Каардынаваў дзеянні франтоў у Сталінградскай бітве 1942-1943 гг., у час прарыву блакады Ленінграда, Курскай бітве 1943 года і бітве за Дняпро 1943 года, у Беларускай аперацыі 1944 года. Камандаваў 1-ым Беларускім фронтам у Вісла-Одэрскай аперацыі 1945 года і Берлінскай аперацыі 1945 года.

Падпісаў за савецкі бок акт аб капітуляцыі Германіі 8 мая 1945 года. 24 чэрвеня 1945 года прымаў Парад Перамогі ў Маскве.

З 1953 года Жукаў – першы намеснік, а ў 1955-1957 гг. - Міністр абароны СССР, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1941-1958 гг.

Аўтар кнігі “Успаміны і роздум”.

Імем Жукава названа малая планета.



# Вуліца Заслонава

Рашэннем райвыканкама № 50 ад 20 кастрычніка 1953 года вуліца Чыгуначная перайменавана ў вуліцу імя Заслонава. Вуліца знаходзіцца на зарэчнай частцы горада.

***Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў*** (партызанская мянушка дзядзька Косця) (7.01.1910 г. Асташкаў Цвярской вобл., Расія – 19.11.1942 г.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну.

Закончыў прафесійна-тэхнічную школу ў Вялікіх Луках у 1930 годзе. З 1939 года начальнік паравознага дэпо станцыі Орша. У верасні 1941 года ў Маскве сфарміраваў з чыгуначнікаў партызанскі атрад, у кастрычніку перайшоў з ім лінію фронту, уладкаваўся на працу ў Аршанскае дэпо. Стварыў і ўзначаліў некалькі дыверсійных груп, якія разам з падпольнымі групамі

Аршанскага патрыятычнага падполля паралізавалі работу чыгуначнага вузла. З лютага 1942 года ён камандзір партызанскага атрада, з ліпеня 1942 года – камандзір брыгады. Арганізоўваў дыверсіі на чыгунцы, узначальваў баявыя дзеянні супраць ворага на тэрыторыі Аршанскага, Багушэўскага, Лёзненскага, Сененскага і іншых раёнаў.

Неўміручай славай пакрыў сваё імя ў жорсткіх бітвах з фашызмам на беларускай зямлі Канстанцін Заслонаў. Падпольная арганізацыя чыгуначнага дэпо, якую ён узначальваў, наносілі ворагу вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. Выдатным важаком партызан паказаў сябе К. Заслонаў, з'яўляючыся камандзірам партызанскага атрада, а затым партызанскага "Дзядзі Косці".

14 лістапада 1942 года каля вёскі Купаваць Сенненскага раёна варожая куля абарвала жыццё таленавітага партызанскага кіраўніка.

За заслугі перад Радзімай і гераізм К. Заслонаву было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



# Вуліца Касмадзем'янскай

Гэту назву вуліца атрымала ў 1948 годзе (па рашэнні гарвыканкама №193 ад 14 лістапада 1948 года)

***Зоя Анатольеўна Касмадзям’янская*** нарадзілася ў верасні 1923 года ў Тамбоўскай вобласці. Перад вайной сям’я Зоі пераехала ў Маскву.

У кастрычніку 1941 года вучаніца 10-га класа 201-й маскоўскай школы дабраахвотна ўступіла ў знішчальны партызанскі атрад. У лістападзе 1941 года ў час выканання баявога задання ў варожым тыле яна была схоплена гітлераўцамі ў вёсцы Пятрышчава Верайского раёна Маскоўскай вобласці і пасля жорсткіх катаванняў павешана. Ні катаванні, ні здекі не змаглі прымусіць Зою выдаць сваіх таварышаў і мэту задання. На пытанне гаспадыні дома, як яе завуць, яна назвалася Таняй з Масквы.

16 лютага 1942 года Зое Касмадзем’янскай пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



# Вуліца Кіжаватава

Па рашэнні выканкама № 196 ад 27 жніўня 1969 года ў Кобрыне з'явіўся завулак Кіжаватага. Ён знаходзіцца ў зарэчнай часцы горада.

***Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч*** нарадзіўся 22 жніўня 1907 года ў сяле Кіжаватава Бяссонаўскага раёна Пензенскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1929 года. Быў начальнікам 9 пагранзаставы 17-га Брэсцкага пагранатрада, які размяшчаўся ў цытадэлі Брэсцкай крэпасці. Воіны заставы пад камандаваннем лейтэнанта Кіжаватава раніцай 22 ліпеня 1941 года прынялі першы бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, адбілі 6 атак, двойчы контратакавалі. Кіраваў участкам абароны каля Цярэспальскіх варот, быў некалькі разоў паранены. Загінуў ў баі, прыкрываючы групу прарыву.

Імя Кіжаватава прысвоена пагранічнай заставе, дзе ўстаноўлены яго бюст.

У 1965 годзе А. М. Кіжаватаву пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

# Вуліца Матросава



Па рашэнні выканкама № 177 ад 20 кастрычніка 1948 года вул. Школьная перайменавана ў вуліцу Матросава.

***Аляксандр Мацвеевіч Матросаў*** нарадзіўся ў 1924 годзе ў Днепрапятроўску. Рана страціў бацькоў і выхоўваўся ў Іванаўскім дзіцячым доме Ульянаўскай вобласці і ў працоўнай дзіцячай калоніі ў г.Уфе.

З 1942 года А. Матросаў – у Чырвонай Арміі, ваяваў на Калінінскім фронце. 23 лютага 1943 года ў баі за вёску Чарнушкі (Пскоўская вобласць) гвардыі радавы Матросаў сваім целам закрыў амбразуру нямецкага дзота, гэтым забяспечыў поспех атакі падраздзялення.

Імя Матросава прысвоена 254-му гвардзейскаму палку з залічэннем героя навечна ў спіс палка. Матросаву пасмяротна ў 1943 годзе прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны подзвіг Матросава паўтарылі многія савецкія воіны, у т. л. беларус П. І. Купрыянаў.



# Вуліца Панфілаўцаў

Панфілаўцы – воіны 316-й стралковай дывізіі, якія пад камандаваннем генерал-маёра ***І. В. Панфілава*** гераічна змагаліся супраць германскіх войск у час Маскоўскай бітвы 1941-1942 гг. у Вялікую Айчынную вайну. 7-10 кастрычніка 1941 года дывізія была перакінута на Валакаламскі напрамак. 16 кастрычніка ў час чарговага наступлення праціўніка на Маскву каля раз’езда Дубасекава 28 байцоў 4-й роты 2-га батальёна 1075-га стралковага палка на чале з малодшым палітруком В. Г. Клачковым у 4-гадзінным баі падбілі 18 варожых танкаў. Амаль усе абаронцы загінулі. Легендарным подзвігам панфілаўцы на ўвесь мір праславілі стойкасць і бястрашша савецкіх салдат.

21 чэрвеня 1942 года ўдзельнікам гэтага бою было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 18 лістапада 1941 года 316-я дывізія атрымала найменне 8-й гвардзейскай. 23 лістапада ёй прысвоена імя Панфілава.

# Вуліца В. Харужай



Гэту назву вуліца атрымала 11 сакавіка 1966 года (рашэннем Кобрынскага выканкама № 83). Вуліца знаходзіцца ў цэнтральнай часцы горада.

***Вера Захараўна Харужая*** (парт. і літаратурны псеўданім – Верка, Вераніка Карчэўская, Алеся Шыншына, Анатолька, Падпольнік, Г. С. Карнілава, 27.09.1903 г. г. Бабруйск Магілёўскай вобл. – 4.12.1942 г.), дзеяч рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, арганізатар падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну. Закончыла Цэнтральную савецка-партыйную школу ў 1922 годзе. Харужая – удзельніца Грамадзянскай вайны 1918-1920 гг. Яна настаўнічала, працавала ў Мазырскім і Бабруйскім паветавых камітэтах КСМБ. У 1922-1923 гг. у апараце ЦК КСМБ. З лютага 1924 года яна на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Харужая – адзін з арганізатараў і першы рэдактар органа ЦК КСМЗБ газеты “Малады камуніст”. 15 верасня 1925 года яна арыштавана польскімі ўладамі і прыгаворана да 8

гадоў зняволення. У верасні 1932 года ў ліку 40 абменных палітвязняў Польшчы прыехала ў Мінск. Працавала ў замежнай частцы Цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ, Мінскай школе КПЗБ.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны Харужая – партызанка атрада В. З. Коржа. З вясны 1942 года ў апараце ЦК КП(б)Б у Маскве. У верасні 1942 года на чале групы з 17 чалавек Вера Харужая была накіравана ў Віцебск для арганізацыйнага ўмацавання Віцебскага патрыятычнага падполля. Яна збірала і перадавала камандаванню Чырвонай Арміі і партызанам каштоўныя звесткі пра ворага. У лістападзе 1942 года арыштавана нямецкімі фашыстамі і пасля жорсткіх катаванняў расстраляна.

У 1960 годзе В. Харужай было пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



## Вуліца Гастэлы

Гэту назву вуліца атрымала 15 лістапада 1948 года (па рашэнні гарвыканкама № 193).

***Мікалай Францавіч Гастэла*** (6.05.1907 Масква – 26.06.1941 г.) – Герой Савецкага Саюза (1941 г.). Беларус. Закончыў Лучанскую ваенную школу лётчыкаў у 1933 годзе. З 1932 года – у Чырвонай Арміі. М. Гастэла – удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939 годзе, савецка-фінляндскай вайны 1939-1940 гг.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны капітан Гастэла камандаваў эскадрылляй, удзельнічаў у бамбардзіроўцы танкавай і механізаванай калон праціўніка. 26 чэрвеня ў час бамбардзіроўкі варожай танкавай калоны на дарозе Маладзечна - Радашковічы з членамі экіпажа А. А. Бурдзенюком, А. А. Калінiным, Р. М. Скарабагатавым М. Гастэла накіраваў ахоплены полымем самалёт на скопішча варожых танкаў, аўтамашын і бензацыстэрнаў.

У 1941 годзе камандзіру авіяэскадрыллі капітану Мікалаю Францавічу Гастэла пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



# Вуліца Кашавога

Рашэннем Кобрынскага выканкама № 239 ад 27 верасня 1955 года вуліца атрымала назву Алега Кашавога.

***Кашавой Алег Васільевіч*** (падпольны псеўданім Кашук, 08.06.1926 г., г. Прылукі УССР – 09.02.1943) – адзін з кіраўнікоў падпольнай камсамольскай арганізацыі “Маладая гвардыя”. Член ВЛКСМ. Арганізатар і кіраўнік шматлікіх баявых аперацый. З раскрыццем арганізацыі спрабаваў перайсці лінію фронту, 26 студзеня 1943 года быў схоплены фашыстамі на ст. Картушына і пасля катаванняў расстраляны каля г. Равянькі.

Пасля вызвалення горада Чырвонай Арміяй А. Кашавы быў пахаваны ў брацкай магіле на цэнтральнай плошчы ў Равеньках. У 1943 годзе А. Кашавому пасмяротна прысвоена імя Героя Савецкага Саюза. Яго імем названы шахты, калгасы, школы.



## Вуліца Чарнышова

Вуліца атрымала гэту назву 26 кастрычніка 1979 года (па рашэнні выканкама № 222).

***Чарнышоў Васіль Яўхімавіч*** (26.08.1908 г., с. Красная Арлоўскай вобл., Расія – 12.11.1969 г.), адзін з

арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёр (1943), Герой Савецкага Саюза (1944 г.), савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч.

Закончыў Арлоўскае ваеннае пяхотнае вучылішча ў 1927 годзе, Брамскі камуністычны ўніверсітэт у 1930 годзе. У 1930-е г. В. Д. Чарнышоў – першы сакратар Жлобінскага, Васілішкаўскага райкамаў, Баранавіцкага абкама КП(б)Б і ЦШПР па Баранавіцкай вобласці, з сакавіка 1943 года- сакратар Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б, адначасова камандзір Баранавіцкага партызанскага злучэння Паўночнай зоны.

Пасля вайны В. Чарнышоў – першы сакратар Брэсцкага, Мінскага абкамаў КП(б)Б, у 1950 г. – сакратар ЦК КП(б)Б. З 1951 года Чарнышоў В. Я. – першы сакратар Калінінградскага абкама, з 1959 года – Прыморскага крайкама КПСС. З 1969 года – намеснік старшыні партыйнага кантролю пры ЦК КПСС. Член КП(б)Б у 1949-1952 гг., член Бюро ЦК КП(б)Б у 1949-1951 гг., ЦК КПСС – з 1952 года. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1950 года.

## Вуліца 9 Мая

У 1965 годзе да 20-годдзя з дня Перамогі па рашэнні Кобрынскага райвыканкама № 98 ад 6 мая вуліца Паркавая была перайменавана ў вуліцу 9 Мая.

# Думаць пра жывых, памятаць пра загінуўшых

***Даведнік
па вуліцах Кобрына,
якія носяць імёны ўдзельнікаў
Вялікай Айчыннай вайны***

Складальнікі:
Курачук С. Д.
Аляшкевіч Т. М.

Рэдактар:
Іванова М. В.

Камп'ютарны набор:
Панасюк Ж. Д.